УДК 2

# РЭЛІГІЙНАЕ ПЫТАННЕ І БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У 1917–1918 гг.

**Мазец Валянцін Генрыхавіч,**
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца ўдзел праваслаўнага і каталіцкага духавенства ў грамадска-палітычных працэсах, якія адбываліся на беларускіх землях у 1917–1918 гг.*

Падзел беларусаў паводле рэлігійнай прыналежнасці на каталікоў і праваслаўных і той факт , што беларуская мова не мела права ўжытку як у касцёле, так і ў царкве, даволі працяглы час з'яўляліся тымі перашкодамі, якія запавольвалі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

працэс нацыянальнай кансалідацыі. Разам з тым, ва ўмовах Першай сусветнай вайны сітуацыя пачала паступова змяняцца. У пастанове з'езда беларускіх нацыянальных арганізацый і партый, які адбыўся 25–27 сакавіка 1917 г., адзначалася неабходнасць таго, каб у вучыцельскіх семінарыях, а таксама ў духоўных – праваслаўных і каталіцкіх, было ўведзенае вывучэнне беларускай мовы і літаратуры, а таксама гісторыі беларускага краю. У ліку сябраў створанага на гэтым з'ездзе Беларускага Нацыянальнага Камітэту быў ў ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі. Ад імя БНК Магілёўскаму Арцыбіскупу Эдварду Ропу было прапанавана аддаць беларускаму духавенству ўсе касцёлы, каб у іх можна было весці набажэнствы і пропаведзі па-беларуску, а таксама назначаць у парафіі ксяндзоў-беларусаў, або тых, каторыя ведаюць беларускую мову.

На з'ездзе беларускага каталіцкага духавенства, скліканым 24–25 мая 1917 г. па ініцыятыве ксяндзоў Фабіяна Абрантовіча, Адама Станкевіча, Вінцэнта Гадлеўскага, Францішка Будзькі і інш., была заснаваная Хрысціянска-Дэмакратычная Злучнасць [1, с. 87]. Дзякуючы высілкам ксяндзоў-беларусаў беларуская мова пачала займаць належнае месца ў каталіцкіх храмах. Так, у Мемарыяле "Аб палітычным палажэнні Усходняе Беларусі ад 3 красавіка 1918 г. адзначалася, што ўжо ў цэлым шэрагу касцёлаў набажэнствы праводзіліся на беларускай мове. Найбольш плённа ў гэтым накірунку шчыравалі магістры тэалогіі Адам Лісоўскі, Вінцэнт Гадлеўскі, Лук'ян Хвецька, Андрэй Цікота, ксяндзы Аляксандр Астрамовіч, Францішак Будзька і іншыя.

Неабходна адзначыць, што акрамя душпастырскай, шэраг каталіцкіх святароў ажыццяўлялі на працягу 1917 – 1918 гг. і грамадзка-палітычную чыннасць. Так, ксёндз В. Гадлеўскі з'яўляўся ў снежні 1917 г. дэлегатам Першага Усебеларускага з'езду, а пасля кааптацыі ў склад Рады Беларускай Народнай Рэспублікі на працягу 25 дзён узначальваў камісію па справах бежанцаў. Акрамя В. Гадлеўскага ў склад Рады БНР уваходзіў кс. Карольчык [2, арк. 99].

Ксёндз А. Аўгусціновіч узначальваў заснаваную ў Радашкавічах мясцовую беларускую раду. 25 мая 1918 г. Я. Варонку наведала дэлегацыя Магілёўскай губерні ў складзе А. Астрамовіча і і. Насовіча. Яны былі ўпаўнаважаны весці перагаворы аб адкрыцці на Магілёўшчыне беларускіх школ [3, арк. 81].

6 і 7 жніўня 1918 г. па ініцыятыве ксяндзоў, якія ўваходзілі ў склад Рады БНР, на Дэканальным з'ездзе Дзісненскага Дэканату было пастаноўлена, каб у Дэканаце парафіяльныя школы былі з беларускай мовай выкладання.

З 1 кастрычніка 1918 г. у Мінску адчынілася Каталіцкая Духоўная семінарыя. У семінарыі выкладаліся беларуская мова і літаратара, гісторыя Беларусі. Рэктарам духоўнай семінарыі быў прызначаны ксёндз Ф. Абрантовіч, доктар філасофіі, інспектарам – ксёндз А. Лісоўскі. Вялікія фундацыі дзеля заснавання духоўнай семінарыі былі зроблены княгіняй Магдаленай Радзівіл. Адкрыццё Беларускай Каталіцкай Семінарыі, дзе рыхтавалі святароў беларусаў-католікоў, было мерай, якая павінна была аслабіць анексісцкія памкненні з боку палякаў, асабліва духавенства. Менавіта польскае духавенства, пасля адчынення ў Мінску рымска-каталіцкай кафедры на чале з біскупам Лазінскім у чэрвені 1918 г., выйшла на першы план барацьбы з беларускім нацыянальным рухам. 8 верасня 1918 г. нейкая жанчына збірала ў Мінску подпісы пад прашэннем на імя біскупа Лазінскага аб недапушчэнні беларускай мовы ў касцёле. Але гэтая задума не знайшла многа прыхільнікаў. На сход беларускай секцыі пры саюзе хрысціянскай дэмакратыі не пускалі народ два ксяндзы: Антоній Александровіч і Эмэрык Барысовіч, уступаючы з народам у гарачыя спрэчкі аб шкодзе беларускага руху для мясцовага насельніцтва. Рэктар Дамініканскага касцёла ксёндз Браніслаў Усас выступаў з цэлымі лекцыямі аб безгрунтоўнасці беларускага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

руху і яго шкодзе для каталіцызму, а таксама аб тым, што ніякай беларускай мовы ўвогуле не існуе.

Даволі шырока разгортваўся беларускі нацыянальны рух і ў асяродку праваслаўнага святарства, большасць з якіх у выніку эвакуацыі апынуліся ў эвакуаацыі. Летам 1917 г. у Маскве адбыўся з'езд праваслаўных святароў-беларусаў.

У ліку праваслаўных святароў, якія праявілі найбольшую актыўнасць у справе пашырэння выкарыстання беларускай мовы ў праваслаўных храмах, неабходна адзначыць айца Андрэя Карніловіча, свяшчэнніка Хонаўскай царквы Вілейскага павета. Ён уклаў цэлы зборнік пропаведзяў на беларускай мове. Дыякан Лебедзеўскай царквы Вілейскага павета айцец Іаан Хруцкі шмат працаваў над аб'яднаннем малітваў з перакладамі іх са старaславянскай мовы на беларускую.

Актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці прымаў пратаірэй Сцяпан Кульчыцкі, удзельнік з'езду Беларускага праваслаўнага духавенства ў Маскве. У красавіку 1918 г. ён быў кааптаваны ў склад Рады БНР. Акрамя С. Кульчыцкага ў склад Рады БНР уваходзіў св. Васюкевіч [2, арк. 98].

5 мая 1918 г. на сустрэчы старшыні Народнага Сакратарыята Я. Варонкі з Архіепіскапам Мінскім і Тураўскім Георгіем было закранута пытанне аб рэарганізацыі кіраўніцтва царквы, якая адпавядала б інтарэсам Беларусі, як незалежнай дзяржавы. Архіепіскап Георгій падтрымаў гэтую прапанову і выказаў жаданне арганізаваць пры падтрымцы старшыні Народнага Сакратарыята Асобую камісію, якая займалася б разглядам пытання вяртання духоўных асоб на тэрыторыю Віленскай і Гродзенскай губерній, якая была акупавана германскімі войскамі ў канцы 1916 г., а таксама вырашэння пытання вяртання на месцы ранейшага знаходжання вывезенай у час эвакуацыі ўсёй царкоўнай маёмасці: царкоўных архіваў, званоў [4, арк. 1].

21 чэрвеня 1918 г. на сустрэчы з начальнікам Штаба 10 арміі фон Штапфам Я. Варонка звярнуў увагу на тое, што ў правінцыі многа непаразуменняў выклікаюць адносіны да беларускага пытання польскай інтэлігенцыі. Так, Канцылярыя Народнага Сакратарыяту, якая рэгістравала грамадзян БНР, у маі 1918 г. сутыкнулася з наступнымі фактамі. Пасведчанні, якія выдаваліся польскімі арганізацыямі насельніцтву заходніх губерній Беларусі: Гродзенскай і Віленскай, даволі дэманстратыўна залічвалі гэтыя губерніі да губерній Польскай дзяржавы [3, арк. 202].

Абумолена гэта было тым, што з адзначаных вышэй губерній была эвакуіравана вялікая колькасць праваслаўных святароў і ў выніку мясцовае насельніцтва магло задавальняць свае духоуныя патрэбы толькі праз дзейнасць каталіцкіх святароў, большасць з якіх было палякамі. На сустрэчы была дасягнута дамоўленасць пра пасылку дзесяці праваслаўных святароў ў найбольш вялікія гарады Гродзенскай і Віленскай губерній для абследавання мясцовых прыходаў і ступені патрэбы мясцовага насельніцтва ў праваслаўных святарах. Разам з гродзенскім пратаірэем і. Карчынскім для аднаўлення праваслаўных прыходаў выехалі протаіерэі: І. Гушкевіч – у Беласток, і. Піліхоускі – Бельск, М. Вінаградаў – у Брэст, П.Травін – у Слонім, а таксама святары: В. Пілінкевіч – у Брэст, К. Пілінкевіч і Н. Сабаткевіч – у Пружаны, і. Міхайлоўскі – у Кобрын, К. Ржэцкі – у Ваўкавыск.

## Літаратура


1. Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. Вільня, 1935. – 64 с.
2. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. Ф. 582 Дзяржаўнага Архіву Літвы. Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі / уклад., уступ. арт., камэнтары, паказальнікі Сяргея Шупы. – Вільня; Нью-Ёрк; Менск; Прага, 1998. – 816 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 325. – Вопіс. 1. – Справа 19.
4. Дзяржаўны архіў Літвы. – Фонд 395. – Вопіс 1. – Справа 8.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова